ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар ДУК "Ашмянская раённая бібліятэка"
_____________ Н. В. Садоўская
"15" 01 2026 г.

# ПАЛАЖЭННЕ
## аб раённым бібліятэчным конкурсе па стварэнні лэпбукаў краязнаўчай тэматыкі "КрайBOOK: збяры сваю гісторыю" сярод бібліятэк ДУК "Ашмянская раённая бібліятэка"

## 1. Агульныя палажэнні

1.1. Дадзенае Палажэнне вызначае парадак арганізацыі і правядзення конкурсу "КрайBOOK: збяры сваю гісторыю" па стварэнні лэпбукаў (далей – Конкурс), умовы ўдзелу і катэгорыі ўдзельнікаў, крытэрыі ацэнкі работ, парадак падвядзення вынікаў конкурсу і ўзнагароджання пераможцаў.
1.2. Заснавальнікам конкурсу з'яўляецца ДУК "Ашмянская раённая бібліятэка".
1.3. Арганізатар конкурсу – сектар маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы (СМСД і МР) ДУК "Ашмянская раённая бібліятэка".

## II. Мэта і задачы

2.1. Мэта конкурсу – выяўленне, абагульненне і распаўсюджванне дзейнасці бібліятэкара ў стварэнні інтэрактыўных матэрыялаў для працы з чытачамі.
2.2. Задачы конкурсу:
- развіццё творчага патэнцыялу бібліятэкараў;
- садзейнічанне прыцягненню дзяцей і моладзі да вывучэння гісторыі малой радзімы ў кантэксце краязнаўства;
- садзейнічанне стварэнню вобраза прывабнай і сучаснай бібліятэкі.

## III. Тэрміны і ўмовы правядзення

3.1. У конкурсе прымаюць удзел бібліятэкары ДУК "Ашмянская раённая бібліятэка".
3.2. Тэрмін правядзення конкурсу: студзень – чэрвень 2026 г.

3.3. Конкурсныя работы неабходна прадаставіць не пазней 10 ліпеня 2026 г. у сектар маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы ДУК "Ашмянская раённая бібліятэка".

## IV. Патрабаванні да работ конкурсу

4.1. Конкурснае заданне заключаецца ў стварэнні лэпбука, які адлюстроўвае інфармацыю краязнаўчай тэматыкі: гісторыя, культура, прырода, сённяшні дзень і г. д. Ашмяншчыны (Гродзеншчыны).
***Лэпбук*** *(lapbook, lap – калені, book – кніга) – гэта самаробная інтэрактыўная папка, альбом, раскладанка і г. д. з кішэнькамі, міні-кніжкамі, акенцамі, рухомымі дэталямі, ўстаўкамі, якія можна даставаць, раскладваць, складаць па сваім меркаванні.*
4.2. Аўтарскі лэпбук павінен валодаць наступнымі якасцямі:
− інфарматыўнасць;
− функцыянальнасьць;
- валоданне дыдактычнымі ўласцівасцямі;
− даступнасьць.
4.3. Пры стварэнні лэпбукаў бібліятэкары маюць права выкарыстоўваць любую праўдзівую інфармацыю, наяўную ў іх распараджэнні, не парушаючы аўтарскіх правоў.

## V. Крытэрыі ацэньвання работ

5.1. Ацэнка конкурсных работ адбываецца па наступных крытэрыях:
- адпаведнасць зместу работы тэме, мэтам і задачам конкурсу;
- арыгінальнасць і эстэтыка афармлення, якасць і складанасць выканання (наяўнасць цікавых атрыбутаў і дэталяў для афармлення), выкарыстанне выразных сродкаў, адпаведных ўспрымання аўтара.

## VI. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне

6.1. Працы, якія не адпавядаюць патрабаванням гэтага Палажэння, журы не ацэньваюцца.
6.2. Для падвядзення вынікаў конкурсу вызначаецца журы ў складзе дырэктара, намесніка дырэктара ДУК "Ашмянская раённая бібліятэка", супрацоўнікаў СМСД і МР Ашмянскай раённай бібліятэкі.
6.3. Вынікі конкурсу падводзяцца да 1 жніўня 2026 г. і афармляюцца пратаколам.
6.4. Вызначаюцца пераможцы, якія занялі I, II і III месцы.
6.5. Узнагароджанне пераможцаў конкурсу адбудзецца не пазней за 15 кастрычніка 2026 г.

Палубінская В.А. 21409